У сферы моўнай дзейнасці, дзе патрабуецца высокая маўленчая культура (а гэта рэжысёры, сацыяльныя педагогі, бібліятэкары і інш.), парушэнне арфаэпічных нормаў недапушчальна. Трэба ўмець правільна і дакладна выказваць свае думкі, выбіраць найбольш прыдатнае, выразнае, вобразнае слова, найлепшы варыянт сінтаксічнай канструкцыі для канкрэтнага выказвання, умець карыстацца мовай ў розных жыццёвых сітуацыях з улікам задач і абставін моўных зносін. Набыць такое ўменне дапамагаюць заняткі па роднай мове, на якіх трэба даносіць да сэрца і розуму кожнага студэнта любоў да роднага слова, паказваць багацце нашай мовы, дапамагчы адчуць неабходнасць ведаць і ўжываць яе.

Перад выкладчыкам пастаўлена задача, у першую чаргу, клапаціцца пра фарміраванне ў студэнтаў нормаў вуснага маўлення, а г.зн. даць не толькі неабходныя тэарэтычныя звесткі па арфаэпіі, замацаваць у свядомасці патрэбныя маўленчыя навыкі і засцерагчы ад непатрэбных, а і садзейнічаць асабістай адказнасці за маўленчыя паводзіны, за стан маўленчай культуры навучэнцаў. Больш таго, неабходна выпрацаваць і развіць уменне карыстацца літаратурнай мовай усюды і заўсёды.

Сёння грамадства пачынае ўсведамляць, што без ведання роднай мовы, без упэўненасці ў тым, што яе будучыня гарантавана, немагчыма развіццё літаратуры, іншых відаў мастацкай культуры. Апрача таго, далучанасць усіх народаў да нацыянальнай мовы - гэта важны фактар палітычнай стабільнасці і маральнага здароўя грамадства.

**Няфёдаў В.В.,**
**прафесар**

## ПРОБЛЕМА ИЗУЧЕНИЯ ИСКУССТВА БУНИНА В СВЯЗИ С АВАНГАРДИСТСКИМ НАПРАВЛЕНИЕМ

В студенческой и педагогической среде ощущается острый интерес к проблеме «реализм и авангардизм». Так возникает актуальная учебно-методическая задача решения этой проблемы на конкретном, в частности историко-литературном материале, который требует к себе избирательного подхода. Здесь необходимо привлечение наиболее выразительного в эстетическом отношении творческого наследия.

В современном эстетическом мышлении (например, в «новой журналистике») делаются попытки обесценить художественный текст как отражение личности творца, занимающего определенную гражданскую позицию, представить писателя как чувствилище фактов, вырванных из социально-общественных связей. Таким образом, писатель лишается роли мыслителя, учителя жизни, борца за прогресс. Лучшие достоинства индивидульности большого мастера прошлого, например И.А.Бунина, служат примером для художника наших дней, долг которого состоит в том, чтобы создавать настоящие нравственно-эстетические ценности, помогать людям становиться чище, сильнее, укреплять фундаментальные основы их общественного бытия.

Реалистическое искусство Бунина- торжество изобразительности в условиях экспансии авангардизма, который отказывается от изучения объекта, в своих крайних проявлениях отталкивает живопись как форму познания бытия, делает вместо нее косную сущность, бездуховную материю (например, распад поэтического языка в экспериментах А.Крученых, его подача только языкового материала). Бунин своим искусством выступил против отказа от изобразительной традиции - от постижения мира, трезвого видения его, отказа, который наблюдал в авангардистской культуре и на Родине, и на Западе. Так, в 1913г. Б.Лифшиц в футуристической программной статье к сборнику «Дохлая луна» отрицал «всякую координацию... поэзии с миром».

В наше время в духовной сфере человеку навязывается авангардистская тенденция иррационального. Например, сюрреализм или театр абсурда пронизаны истерической жаждой безумия, душевного хаоса, мистицизмом. Модернистскому искусству свойственен пафос отречения от разума ради иллюзий душевной свободы от стандартного буржуазного существования в ординарной среде капитализма.

Бунин-художник, оставаясь в границах личного творческого опыта, - союзник передового отряда мировой общественности. Неслучайно демократическая мысль пристально изучает его представления о реальности как ценные индивидуальные отображения исторических фактов. Бунин - убежденный гуманист. Он не представлял себя «вне изобразительного» искусства.

Адамовіч Я.К.,
дацэнт

## ЗБОРНІК ЯНКІ КУПАЛЫ «СПАДЧЫНА» Ў СВЯТЛЕ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ

На грунце новых навеваў часу працэс навучання ў вышэйшай навучальнай установе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабуе новых падыходаў і накірункаў, звязаных з дэмакратызацыяй грамадства і чарговым адраджэнскім рухам. Менавіта ў сувязі з гэтымі з'явамі наспела патрэба ў пераглядзе ранейшых стэрэатыпных падыходаў і поглядаў на паэтычную спадчыну Янкі Купалы. Як вядома, яна вывучалася ў перыяд сацыялістычнага рэжыму не ў поўным аб'ёме і ў асноўным у адпаведнасці з бальшавіцкай партыйнай ідэалогіяй таталітарнага рэжыму. На грунце гэтакіх падыходаў некаторыя творы паэта з канца 20-х гг. зусім не вывучаліся і не друкаваліся ці друкаваліся вельмі рэдка. Пра гэта сведчаць п'еса «Тутэйшыя», шмат якія творы са зборнікаў «Жыве Беларусь» і «Спадчына». Апошні зборнік паэта быў выдадзены ў 1922 годзе і факсімільна перавыдадзены выдавецтвам «Мастацкая літаратура» ў 1992 г. Змест гэтага зборніка сведчыць, што 18 твораў паэта («Брату-беларусу», «Годзе», «Беларушчына», «Матцы», «Сярод раз'юшаных сатрапаў...», «Тут і там», «Крыўда», «Наша гаспадарка», «Думка», «Сваякі» і інш.) не былі ўключаны ў сямітомны збор твораў Янкі Купалы і практычна не былі вядомымі маладзейшым пакаленням.

У сувязі з праграмным вывучэннем творчай спадчыны Янкі Купалы наспела неабходнасць разгледзіць зборнік «Спадчына» ў святле беларускага нацыянальнага адраджэння, скіраваўшы ўвагу на нацыянальнае.

1. На прыкладзе вершаў розных гадоў засведчыць актыўнае імкненне Янкі Купалы да сацыяльнага і нацыянальнага разнявлення беларускага мужыка і роднай старонкі.

2. Засяродзіць увагу на пытаннях нацыянальнага абуджэння і адраджэння праз гістарычную памяць, праз павагу да культурных набыткаў мінуўшчыны.

3. Тэма моцных суседзяў у дачыненні да развіцця і захавання культуры беларусаў («Годзе...», «Апекунам», «Сярод раз'юшаных сатрапаў...», «Цару неба і зямлі», «Хай жа вам так не здаецца...» і інш.). Вера ў светлую будучыню роднага краю.

4. Фальклорныя матывы і аўтарская пазіцыя ў асвятленні сацыяльна-бытавой тэматыкі («Песні вайны», «Сявец», «Поле роднае», «З песень нядолі», «З песень мужычых», «З сірочай долі», «Тут і там», паэмы «Яна і я», «Зімою» і інш.).

5. Лірычны герой з яго ўяўленнямі, філасофіяй і заклікальнасцю да абуджэння.

У заключэнне звяртаем ўвагу на тэматычную сувязь, зладжанасць і адметнасць частак зборніка «Спадчына».

Садаўнічы Э.В.,
дацэнт
Суддзева Н.Л.,
дацэнт

## «ПОСТМАДЭРНІЗМ» І ТРАДЫЦЫІ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦТВЕ

У апошнія некалькі гадоў у літаратуразнаўстве пільнай увагай карыстаюцца такія мастацкія з'явы, якія атрымалі назву «постмадэрнізм» і вельмі часта атоесамліваюцца з авангардным накірункам у мастацтве. Між тым французскія філосафы Ліатар і Дэрыда, якія ўвялі ў навуковы ўжытак тэрмін «постмадэрнізм», яшчэ напрыканцы 60-х, у 70-я гады ў паняцце «сучаснае светаўспрыманне і светаразуменне» ўключылі ўсе светапоглядныя і духоўныя пошукі чалавецтва ад антычнасці да XX ст., якія вызначылі магістральную лінію развіцця грамадства і чалавека і абумовілі цяперашняе нашае ўяўленне аб свеце і аб саміх сабе (сюды ўваходзяць усе «мадэрнізмы» і «авангардызмы»).

Катэгорыя «постмадэрнізм» (постаангардызм) канстатуе неадэкватнасць нашых ведаў аб сапраўднасці. Рэчаіснасць і мы ў сваіх уяўленнях аб рэчаіснасці існуем як бы ў паралельных светах. Добрыя па сваіх намерах ідэі, што з'яўляліся вынікам пэўных абагульненняў грамадскіх працэсаў, падчас іх ажыццяўлення ператвараліся ў сваю супрацьлегласць, абарочваліся благам для людзей. Як выйсце з такога становішча вынікае выснова: трэба адкінуць усе «сучасныя веды» (мадэрнізм) як памылковыя і шлях спазнання свету пачаць з самага пачатку.

Гэтае новае светаадчуванне, напрыклад, знаходзіць адбітак яшчэ ў 30-я гады ў творчасці амерыканца Роберта Говарда. Ён з'яўляецца адным з заснавальнікаў даволі распаўсюджанай літаратуры «фэнтэзі» (ненавуковай фантастыкі), ад якой адгалінавалася, думаецца, літаратура «жахаў».

Галоўнай вызначальнай рысай сучаснага постмадэрнізму з'яўляецца выяўленне неадпаведнасці ведаў чалавека аб жыцці рэальнай хадзе падзей. Пры гэтым постмадэрнісцкія творы не сцвярджаюць абсурдызму быцця, як гэта робіць авангардная літаратура абсурду, і не адмаўляюць магчымасці яго пазнання, што характэрна для экзэстэнцыялізму.

Асабліва прыдатнай глебай для распаўсюджання постмадэрнісцкага мастацтва з'яўляецца постсавецкая рэчаіснасць, якая ўшчэнт разбівае ўсе ідэі і намаганні павярнуць жыццё да лепшага і ператварае іх у далейшыя крокі да горшага. Выразна назіраюцца постмадэрнісцкія матывы ў творах беларускіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ